# Мазураў Кірыла Трафімавіч

Мазураў Кірыла Трафімавіч нарадзіўся ў 1914 годзе ў вёсны Рудня-Прыбыткоўская Гомельскага раёна. Гомельсвай вобласці. Член КПСС з 1940 года.

У 1933 годзе тав. Мазураў К. Т. скончыў Гомельскі аўтадарожны тэхнікум і працаваў тэхнікам, а затым—загадчычам Камарынокага ваеннага дарожнага адізела.

З 1936 па 1938 год тав. Мазураў К. Т. служыў у радах Савецкай Арміі. Пасля дэмабилизацыі з арміі працаваў у палітаддзеле Беларусвай чыгункі. У чэрвені 1939 года быў адклікан Гомельскім абкомам КП(б)Б на камсамольсвую работу.

З сакавіка 1910 года тм. Мазуваў К. Т. працаваў сакратаром Гомельскага гаркома камсамола, а з верасня 1940 года—першим сакратаром Брэсцкага абкома ЛКСМБ.

З пачатку Вялікай Айчыннай вайны тав. Мазураў К. Т. знахадзіўся ў Франтавых часцях Савецкай Арміі, удзельнічаў у баях супраць нямецка-фашисцкіх захопнікаў, быў ранен.



У 1942 годзе тав. Мазураў К. Т, быў адклікан ЦК КП(б)Б з Савецкай Арміі, зацверджан сакратаром ЦК камсамола Беларусі і неправая у тыл ворага. дзе працаваў у партызаінскіх злучэннях раду абласцеі Беларусі. У чэрвені 1946 года тал. Мазураў К. Т. быў выбран першым сакратаром ЦК ЛКСМБ. Скончыў завочнае аддзяленн Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК КПСС.

З 1947 па 1949 год тав. Мазураў К. Т. працаваў у апараце ЦК КЦ Беларусі, а ў 1949 годзе быў выбран сакратаром Мінскага гаркома КПБ.

З 1950 па 1953 год тав. Мазураў В. Т. працаваў першым сакратаром Мінскага гаркома КПП. У жніўні 1953 года Указам Прэзыдыума Вярхоўінага Савета БССР ён назначаецца Старшынёй Савета Міністраў Беларускай ССР. У ліпені 1956 г. выбіран першым сакратаром ЦК КП Беларусі.

На XX з'ездзе КПСС тав. Мазураў К. Т. выбран членам Цэнтральнага Камітэта КПСС, а на чэрвеньскім Пленуме ЦК КПСС у 1957 годзе выбран кандидатам у члены Прэзідыума ЦК КПСС.

За заслугі перад Савецкай Радзімай у гады Вялікай Айчыннай вайны у мірным будаўніцтве тав. Мазураў К. Т. узнагароджан двума ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені і чатырма медалямі.

Тав. Мазураў К. Т. — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР трэцяга і чацвёртага скліканняў, депутат Вярхоўнага Савета БССР.

Тав. Мазураў К. Т. зарэгістрыраван кандыдатам у депутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР па Мінскай гарадской-другой выбарчай акрузе № 589.